Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 ЖНІЎНЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 163 (28273)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Крэдыт на будаўніцтва — пад 17 %

СТАР. 3

Сямейная газета



## Калі бабуля — клаўнеса



## Якія зёлкі збіраць у верасні?

*ЛІЧБА ДНЯ*

**745,8 рубля**

*склала ў краіне налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў за ліпень 2016 года (у чэрвені — 738,7 рубля з улікам дэнамінацыі), паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Налічаная сярэдняя заработная плата рабочых і служачых у ліпені гэтага года складала 748,1 рубля (у чэрвені — 741,7).*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.08.2016 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9522 ▲ |
| Еўра | 2,2030 ■ |
| Рас. руб. | 0,0300 ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0769 ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# СЭЛФІ НА ДАРОЖКУ




**Гэтымі днямі Дзяржаўтаінспекцыя Брэсцкай вобласці праводзіць цікавую акцыю — конкурс на лепшае фота з супрацоўнікам ДАІ. Дэвіз у такой імправізаванай фотаздымкі адзін: «Я і ДАІ — разам за бяспеку на дарогах!» Берасцейцы з прыхільнасцю паставіліся да гэтай ідэі, прываблены абяцанымі прызамі пераможцам і магчымасцю зрабіць фота з незвычайным сюжэтам. Сям'я ШЧАРБАКОВЫХ, напрыклад, спынілася, каб зрабіць сэлфі з інспектарам ДПС Андрэем ХВЕСЮКОМ.**

Фота БЕЛТА.

# ЯДНАННЕ НЕБА І ЗЯМЛІ

XXIII Дзень беларускага пісьменства. Рагачоў 2016

### Міжнародная навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да Святыняў» з Дабрадатным Агнём ад Гроба Гасподняга рушыць з Мінска ў Рагачоў 31 жніўня

**Яна пройдзе ў нашай краіне ўжо 23-ці раз і па традыцыі ў першую нядзелю верасня, у сталіцы Дня беларускага пісьменства горадзе Рагачове адбудзецца пасадка Саду Малітвы. Божая літургія ў храме Святога Аляксандра Неўскага пачне і благаславіць галоўны дзень мерапрыемстваў гэтага знакавага дзяржаўнага свята.**

*— Па сутнасці, навукова-асветніцкая экспедыцыя — акадэмія на колах, асвечаная Дабрадатным Агнём ад Гроба Гасподняга, — кажа* ***ініцыятар заснавання экспедыцыі, кіраўнік дваццаці адной экспедыцыі, ганаровы кіраўнік сёлетняй, заслужаны работнік культуры, пісьменніца Ніна ЗАГОРСКАЯ.*** *— Дзве святыні ў нашым перасоўным храме на колах: Непагасная Лампада Духоўнасці з Дабрадатным Агнём, які прайшоў у 1992 годзе праз праваслаўныя святыні ўсіх славянскіх дзяржаў з Іерусаліма ў Маскву на Міжнароднае Свята славянскага пісьменства і славянскіх культур пад дэвізам «Адзінствам і любоўю ўратуемся». Гэта словы благаславення Сергія Раданежскага Дзмітрыю Данскому на Кулікоўскую бітву. У гэтых словах — сэнс і змест экспедыцыі. На гэта скіраваны хрэсныя ходы да праваслаўных святыняў — храмаў, манастыроў, капліц, дзе адбываюцца малебны і перадача Дабрадатнага Агню на свечкі прыхаджан. На гэта скіравана пасадка Садоў Малітвы — пад кожнае дрэўца падсыпаецца асвечаная зямля з усіх адрасоў на маршрутах усіх штогадовых пяцідзёнfamous экспедыцый — а гэта да сямнаццаці гарадоў, пасёлкаў і вёсачак штогод.*

СТАР. 13

# І стала жудаснаю ноч

### У Італіі магутны землятрус: колькасць загінулых расце

**Удар падземнай стыхіі адбыўся ў цэнтральнай Італіі ў ноч на сераду, 24 жніўня, што прывяло да сур'ёзных разбурэнняў у некалькіх гарадах.**

Ваганні зямной паверхні адчуваліся ў шэрагу гарадоў цэнтральнай Італіі, у тым ліку ў Рыме і Балонні. Паводле інфармацыі, якая паступае, разбурэнні адбыліся як мінімум у трох правінцыях — Асколі Пічэна, Ферма і Мачэрата (вобласць Марке).

Колькасць ахвяр працягвае расці. Спачатку паведамлялася пра шэсць загінулых, потым гаворка ішла пра 14 ахвяр. Па апошніх звестках мясцовых СМІ, у выніку землятрусу загінулі 84 чалавекі. Невялікі горад Акумолі, за два кіламетры ад якога знаходзіўся эпіцэнтр землятрусу, напалову разбураны, шмат людзей знаходзіцца пад заваламі, паведаміў мэр горада Стэфана Петручы. «Разбурэнні закранулі казарму карабінераў, цэрквы і многія жылыя дамы. У многіх месцах адсутнічае тэлефонная сувязь. Зараз сюды прыбылі ратавальнікі. У цэнтры горада вядуць работу групы пажарных», — сказаў мэр.

Інфармацыі аб наяўнасці грамадзян Беларусі сярод ахвяр землятрусу ў Італіі няма. Пра гэта гаворыцца ў твітэр-акаўнце пасольства Беларусі ў Італіі. Адзначаецца, што пасольства старанна адсочвае сітуацыю ў сувязі са стыхійным бедствам у цэнтральнай Італіі.

*Раней у МЗС папрасілі грамадзян, чые родныя знаходзяцца ў пацярпелых ад землятрусу раёнах Італіі і не выходзяць на сувязь, паведаміць пра гэта па тэлефоне +393454803465.*




Reuters